

# ПРАКОЦІМСЯ З ВЕТРЫКАМ

**Першае, што мы бачым, прыехаўшы ў Маладзечна на аўтобусе, — так званыя вароты горада, вакзал. Ён не горшы, чым у Мінску: электроннае табло, зручныя крэслы ў зале чакання, тэрміналы для набыцця квіткоў, выявы турыстычных славутасцяў горада. Аўтавакзал належыць аўтобуснаму парку №4 г. Маладзечна, адзінаму філіялу ў структуры «Мінаблаўтатранса» з трыма аўтавакзаламі. Сёння аўтапарк ажыццяўляе перавозкі як унутры Беларусі, так і за яе межамі. Пра гэта і тое, у якім кірунку плануе развівацца прадпрыемства, расказаў дырэктар аўтапарка Уладзіслаў УСЦЮШЭНКА.**

***— Якія ў прадпрыемства асноўныя накірункі працы?***

— Сёння амаль любое транспартнае прадпрыемства працуе ў дзвюх сферах: пасажырскія і грузавыя перавозкі. З улікам знешніх фактараў, калі эканоміка краіны перажывае не самыя лепшыя часы, то на першым накірунку гэтыя працэсы адбываюцца перш за ўсё. У апошнія месяцы назіраецца падзенне пасажыраабароту амаль на 20%. Людзі сталі ездзіць менш, эканоміць больш.

Мы адзінае прадпрыемства, якое ўваходзіць у структуру «Мінаблаўтатранса» і валодае трыма аўтавакзаламі. Абслугоўваем Маладзечанскі і Мядзельскі раёны. Дзякуючы ўзроўню дапамогі мясцовых улад, своечасовасці выплат датацый (бо такія кірункі, як пасажырскія гарадскія і прыгарадныя перавозкі, прыбытку не прыносяць) прадпрыемства трымаецца на плыву.



Грузавы аўтапарк таксама адчувае праблемы, бо пры скарачэнні рынку транспартных паслуг падчас крызісу тыя прыватныя перавозчыкі, якія былі нябачныя для нас раней, цяпер далучыліся і да нашых ніш працы. Яны выйшлі на рынак з больш нізкімі цэнамі, бо не маюць той надбудовы, што аўтапарк. Сёння іх цэны амаль у два разы меншыя, чым нашы, і таму ў гэтай сферы мы нясём страты амаль па ўсіх кірунках. Аднак у апошні час палепшыўся стан з міжнароднымі грузавымі перавозкамі, дзе працуюць 7 машын: 3 новыя МАН 2014 года і 4 IVECO 2008 года.

***— Міжнародны кірунак перавозак сёння прыбытковы?***

— Так. Што тычыцца пасажырскіх перавозак, то здзяйсняем мы не толькі гарадскія і прыгарадныя, але і міжнародныя перавозкі. У турыстычны сезон пастаянна ладзім туры ў Еўропу: краіны Балтыі, Балканы, у Іспанію, Партугалію, Германію. Круглы год нашы аўтобусы ездзяць у гарады Расіі. Зараз думаем аднавіць працу з Украінай.

Грузавыя міжнародныя перавозкі адбываюцца ў Еўропу, краіны Балтыі, Данію, Германію, Венгрыю, Румынію, Расію, Казахстан. У вялікім аб'ёме ўдзельнічаем у будаўніцтве 2-й Мінскай кальцавой аўтадарогі. Сёння праца на ёй складае 80% выручкі ад нашай самазвальнай тэхнікі.

Увогуле прадпрыемства мае ў рухомым саставе 133 аўтобусы і 61 грузавік. Частку пасажырскага транспарту плануецца абнавіць. Па плане гэтага года Маладзечанскі раённы выканаўчы камітэт плануе дапамагчы закупіць 8 аўтобусаў «ПАЗ» прыгараднага назначэння. Гэта значна палепшыць нашу сітуацыю, дазволіць правесці структурныя змены ў сабекошце, бо гэта транспарт малой змяшчальнасці і таму патрабуе менш паліва, чым звычайныя аўтобусы.

***— Якія планы на гэты год?***

— З мінулага года мы пачалі ўсталёўваць шматканальныя відэарэгістратары на прыгарадным транспарце. Па-першае, такім чынам мы дысцыплінавалі вадзіцеля і пасажыра з пункту гледжання фінансаў. Бо цяпер усе спрэчкі вырашаюцца прасцей, калі на запісе відаць, хто каму даў колькі грошай. Наша інфармацыя захоўваецца каля 2 месяцаў, а калі адбыўся інцыдэнт, то пастаянна. Па-другое, паколькі камера шматканальная, то яна сочыць і за салонам, і за дарогай. Усе дарожныя канфлікты, аварыі сталі прасцей вырашацца. Па-трэцяе, мы не трацім грошы на праверку пасажырапатоку, а вывучаем яго па відэазапісе. У нашых планах — усталяваць 46 відэарэгістратараў (ужо працуюць 36).

Ёсць планы і па мадэрнізацыі тэхнічнай часткі прадпрыемства. Плануем закупіць спецтэхніку і такім чынам выйсці на гэты новыя для нас рынак паслуг. Напрыклад, маладзечанскае перапрацоўчае прадпрыемства ТАА «Вялес-Міт» мае пэўны попыт на жывёлавоз. Таксама плануем правесці рамонт майстэрняў, бо львіная доля абслугоўвання аўтатранспарту адбываецца там, а таксама збіраемся мадэрнізаваць аўтамыйку. Магчыма, што ў сувязі з верагоднай рэструктурызацыяй «Мінаблаўтатранса», пасля якой аўтапарк можа стаць асобнай юрыдычнай адзінкай, больш мабільнай, планы зменяцца.

***— Усе гэтыя дасягненні сталі магчымымі дзякуючы...***

— Мне пашчасціла з калектывам, бо супрацоўнікі ў нас — майстры сваёй справы. Ёсць і тыя, хто ўсё жыццё адпрацаваў у аўтапарку. Сёння ў нас працуе 516 чалавек. З іх 212 — кіроўцы, 72 — кандуктары, у майстэрнях — 65 супрацоўнікаў. Калі я год таму ўзначаліў парк, 30% калектыву складалі пенсіянеры. Цяпер склад стаў больш «юным»: ва ўзросце да 40 гадоў працуе 38%, а дагэтуль было 28%. Прыходзяць да нас і маладыя спецыялісты, з іскрынкай у вачах і жаданнем працаваць. Два святы мы адзначаем разам: Новы год і наша прафесійнае — Дзень аўтамабіліста. Мне прыемна, што са мной працуюць такія людзі.

**Вераніка СУШКО, аператар ПЭВМ.**
**Яе непасрэдная праца — кантроль за сістэмай відэарэгістрацыі:**

— Я пяць гадоў адпрацавала кантралёрам-рэвізорам. Мая сённяшняя праца — такі ж кантроль, толькі ўжо ў рэжыме анлайн. Я прыходжу з раніцы, іду ў аўтобус і здымаю відэарэгістратар — вялікую флэшку, на якой запісваецца 14 дзён працы кіроўцы з 5 раніцы і да 11 вечара. Падключаю да камп'ютара, бяру квіткі, якія ён прадаў за гэты час, і праглядаю, каб не было выпадкаў, дзе вадзіцель раптам недадаў рэшту ці паводзіў сябе непаважліва.

Пасажыры, якія забылі рэчы ў салоне аўтобуса, звяртаюцца з заявай у міліцыю, а яна — да нас па запіс. На ім відаць усё, нават якія грашовыя купюры даюць адно аднаму пакупнік і кіроўца: відэа HD-якасці. І яшчэ часта цікавіцца Дзяржаўтаінспекцыя, бо ў відэарэгістратара тры камеры: у салоне, побач з вадзіцелем і з відам на дарогу. Таму ўсе супярэчлівыя моманты можна адсачыць.

З таго моманту, як усталявалі відэарэгістратары, з аднаго боку, вадзіцелі сябе сталі больш паважліва паводзіць у дачыненні да пасажыраў, а з другога, прызнаюцца, што і адчуваюць сябе спакайней. Яны могуць без перасцярогі пакінуць грошы ў салоне, бо перасталі адбывацца крадзяжы — усё запісваецца на відэа. Цяпер не бывае ніякіх боек, ніхто не распівае алкаголь у салоне. Калі людзі ведаюць, што за імі сочыць электроннае вока, то паводзяць сябе больш прыстойна. Цяпер у нас нават ёсць кіроўцы, якія спецыяльна просяць, каб ім далі аўтобус з відэарэгістратарам.



**Кіроўцы ў аўтапарку штодзень праходзяць праверку на стан алкагольнага ап'янення. На фота — фельчар Ніна САМАЛЬ і кіроўца Яўген ВАСІЛЕЎСКІ.**



**У дыспетчарскай заўжды добрая атмасфера.**
**На фота — Ірына СОДНІК, дыспетчар па грузавым аўтатранспарце, дыспетчар Вольга ЧУКОВІЧ і старшы дыспетчар Галіна ТРАПІШЧОНАК.**

**Міхаіл ІЛЬКЕВІЧ,**
**слесар-акумулятаршчык,**
**працуе ў аўтапарку №4 амаль паўстагоддзя:**

— У аўтапарку я працую з 8 лютага 1968 года. Таму, лічыце, 49-ы год пайшоў. Раней працаваў вадзіцелем. Вазілі экскурсіі, ездзілі начамі, зрок стаў падаць. Камісія да ваджэння дапускала, але я сам хваляваўся, таму з цягам часу перайшоў працаваць у майстэрню. І да сённяшняга моманту тут. Вядома, праца мне падабаецца, бо інакш чаму б столькі гадоў заставаўся на адным месцы?



**Міхаіл ІЛЬКЕВІЧ з малодшым сынам Міхаілам.**

Раней у аўтапарку былі зусім іншыя ўмовы працы: не было гарачай вады, сталовай, гардэроба, мікрахвалёўкі, халадзільніка. Раней прыйдзеш а палове чацвёртай раніцы, стаіць ледзяны аўтобус, рампы грэем... Цяпер усё больш механізавана, запчасткі і інструменты добрыя. Імі працаваць — адно задавальненне. Іншая справа, што мы прывыкаем да добрага і не заўжды гэта цэнім.

Памятаю, у 1980-м нас рыхтавалі да таго, што мы будзем абслугоўваць транспарт падчас летніх Алімпійскіх гульняў. Быў строгі інструктаж. Нават з КДБ прыязджалі, расказвалі, як сябе трэба паводзіць. Нам тады выдалі новыя касцюмы, далі новыя аўтобусы... Але амерыканцы байкатавалі Алімпіяду, і ў апошні момант усё адмянілі.

Я ўжо 10 гадоў як на пенсіі, але ўсё адно працую. Тут, дарэчы, і два мае сыны таксама. Ведаеце, гэта справа ладу жыцця: працаваць ці не, сумленна альбо абыякава ставіцца да справы, якую робіш. Усё залежыць ад самога чалавека.

**Вольга КАРАСТАЛЁВА,**
**вядучы спецыяліст па турызме:**

— У нас адны з самых прывабных коштаў у Маладзечне. У адрозненне ад іншых турыстычных фірмаў у сваім распараджэнні мы маем уласны транспарт, таму можам арганізоўваць паездкі для груп памерам ад 20 да 50 чалавек. Імкнёмся ва ўсім задаволіць кліентаў, таму, калі неабходна, распрацоўваем індывідуальныя маршруты, хоць прапануем і гатовыя. Цяпер, напрыклад, найбольшай папулярнасцю карыстаюцца туры выхаднога дня з экскурсіяй і шопінгам у Вільнюс, Смаленск і Беласток, Санкт-Пецярбург. Унутры Беларусі — гэта Гродна, Брэст, Мір — Нясвіж і Мінск — Мінская вобласць. У залежнасці ад грашовых магчымасцяў заказчыкаў прапануем камфартабельныя айчынныя ці замежныя аўтобусы.

Для школьнікаў ці для карпаратыўнага адпачынку арганізоўваем выезд для гульні ў лазартаг, на скаладромы. Увогуле сённяшніх дзяцей музеем не здзівіш. Таму, напрыклад, падчас экскурсіі ў Мінск прапануем наведаць музей Мінскага метрапалітэна, хімічнае шоу, пабачыць экзатычных жывёл. У Лідскім замку паўдзельнічаць у рыцарскім турніры, пастраляць з катапульты і патанцаваць сярэдневяковыя танцы. Мы заўжды прыслухоўваемся да пажаданняў кліентаў і імкнёмся іх выканаць, бо даражым кожным станоўчым водгукам і задаволеным турыстам!




УНП 601070223